# СВАБОДА

№17(32), 24 ЖНІЎНЯ 2006 г.


# КАМУ Ў БЕЛАРУСІ «ЖЫЦЬ ХАРАШО»?

## КРАСЦІ МІЛЬЁНЫ ДАЗВОЛЕНА ТОЛЬКІ «НАБЛІЖАНЫМ ДА ЦЕЛА»



**Першы Мінскі аўтасалон**, *24 траўня 2006 году.*

Столькі новых даражэзных “мерсаў” і “лексусаў”, колькі ездзіць сёння пад беларускімі нумарамі па вуліцах сацыялістычнага Мінска, вы не пабачыце ані ў буржуазнай Варшаве, ані ў капіталістычных Рызе і Вільні. Капіталісты – людзі рацыянальныя, яны ведаюць, што ўкладаць у аўтамабіль больш за $30 тысяч – гэта ўжо “панты”, грошы, выкінутыя на вецер дзеля пустога шыку. Гэта як унітаз з золата. Але гаворка пра іншае: адкуль у сённяшняй небагатай Беларусі столькі “панцёраў”, што красуюцца на сталічным праспекце ў “тачках” ад $100 тысяч і вышэй?

Афіцыйнай катэгорыі грамадзян з такім узроўнем даходаў у нас няма. Бо прызнанне такой катэгорыі супярэчыла б асновам дзяржаўнай ідэалогіі “рынкавага сацыялізму”. Нажыць сабе новага “лексуса”, працуючы на заводзе ці на жніве, у школе ці міністэрстве, у прыватным бізнесе проста немагчыма. Але гэта афіцыйна. А неафіцыйна такая катэгорыя ёсць, што якраз і пацвярджаецца даражэннымі машынамі і даражэннымі катэджамі на кальцавой.

Зрэдку ўскосныя пацверджанні гэтага праскокваюць і ў сродках масавай інфармацыі. Вось расказваюць пра дырэктара завода, якога арыштавалі за растрату $1 млн. Дырэктар сваёй віны не прызнаў, гэта значыць, не растрачваў і не краў. Далей паведамляецца, што пасля таго, як дырэктар вярнуў дзяржаве $1 млн., ён быў адпушчаны на волю. Што ж, сумленны чалавек. Ну, абвінавацілі яго несправядліва, дык ён узяў і сваімі расплаціўся. Апошні, можа быць, мільён аддаў, каб у турме не сядзець.

Альбо вось судзяць чыноўніцу адміністрацыі прэзі-

► СТАР.4

### БЕЛАРУСЬ – РАСІЯ

## ГАЗАВАЯ МІСТЫКА

### АРТЫКУЛ АНДРЭЯ СУЗДАЛЬЦАВА

► СТАР.5

## КСЕНІЯ СІТНІК ЯК СІМВАЛ СССР

### ПРЭМ’ЕРА РУБРЫКІ

► СТАР.6

# АДКУЛЬ ТАК МНОГА ДАРАГІХ АЎТАМАБІЛЯЎ НА ВУЛІЦАХ МІНСКА?

**СЯРГЕЙ, ПЕНСІЯНЕР:**

## “ЖЫЦЬ СТАЛА ЛЕПЕЙ”

Жыццё стала добрае. Вісяць жа плакаты рэкламныя: новы “пежо” – 7 долараў у дзень. Што, скажаце, сям’я настаўнікаў не можа накапіць пару тысяч на першы ўзнос? А пасля дзвесце баксаў з сямейнага бюджэта выкладаць штомесяц? Можа. Вось вам і новае аўто для некрутой сям’і.

**АДАМ ГЛОБУС, ПІСЬМЕННІК:**

## “МЕРСЕДЭСЫ І БМВ – НАРОДНЫЯ АЎТАМАБІЛІ”

На вуліцах Мінска дарагіх аўтамабіляў проста не існуе. Гэта памылковае меркаванне. Так думаюць людзі, якія ніколі не бачылі сапраўды дарагіх аўтамабіляў. Бэнтлі, Ролс-Ройс і гэтак далей. І нашыя Мерседэсы з БМВ – гэта ўсё народныя аўтамабілі. Проста, калі яны ўспрымаюцца намі як элітарныя, дык гэта наша памылка.

**ІРЫНА, ЛЕКАРКА:**

## “НА ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРАЦЫ ЗАРАБІЦЬ НА ІХ НЕМАГЧЫМА”

Адкуль? Я не ведаю. Шчыра кажу. Бо, працуючы на дзяржаўнай працы, купіць такую машыну немагчыма. Значыць, у нас так многа бізнесменаў? Слаба верыцца. Можа, гэта не ўласнікі? Таксама не. Значыцца, такі ў нас вялікі так званы “шэры сектар”. Напэўна, большасць людзей, як і я, не разумеюць, адкуль столькі дарагіх машын у нашай небагатай дзяржаве.

**УЛАДЗІМІР ПАДГОЛ, ПАЛІТОЛАГ:**

## “РАСЦЕ КОЛЬКАСЦЬ ЛАМАЧЧА”

Вашае пытанне некарэктнае. Бо ў ім закладзена хлуслівае сцверджанне – дарагіх. Ніхто не ведае, колькі насамрэч каштуе той ці іншы аўтамабіль. На нашых дарогах шмат замарафечаных аўтамабіляў з прыбалтыйскіх заводаў. Ну, і нашы рупліўцы стараюцца. Мінск у параўнанні з буйнымі сталіцамі, у тым ліку Масквой, гэта жабрацкі горад. Магу прывесці доказ. Калі глядзяць на адзін з маіх аўтамабіляў, прычым глядзяць прафесіяналы, якія займаюцца перагонкай, яны майму аўтамабілю даюць кошт 20-22 тысячы даляраў. А насамрэч ён абышоўся мне ў восем тысяч. Колькасць аўтамабіляў сапраўды расце. Як толькі ты выязджаеш за кальцавую, у любой глухой вёсцы ўсё застаўлена аўтамабілямі. І гэтым аўтамабілям па 30 гадоў. Беларусы могуць каго хочаш на колы паставіць, матор прыставіць, і ён паедзе. Расце колькасць ламачча. Мы адна з першых баз металалому на колах.

**МАРК, ЧЫНОЎНІК:**

## “ТРЭБА ГУЛЯЦЬ, ПАКУЛЬ ДАЮЦЬ”

Акрамя наяўнасці людзей з грашыма, ёсць яшчэ адно тлумачэнне. Гэта нейкі генетычны страх, што адбяруць. Што заўтра ўсё закончыцца. Гуляць трэба, пакуль даюць. Вось і купляюць дарагія машыны, замест таго, каб выкарыстаць гэтыя грошы больш разумна. Укласці іх у акцыі ці, напрыклад, нерухомасць.

**АЛЕСЬ ПУШКІН, МАСТАК:**

## “ТАК ДОБРА, ЯК ЦЯПЕР, НІХТО Ў БЕЛАРУСІ НЕ ЖЫЎ”

Ужо ў самой форме пытання закладзена вострая народная прыхамаць: “Вось чаму ёсць багатыя і бедныя?” З чаго вынікае наступнае пытанне: “А чаму ў мяне няма новага, дарагога аўто?” Але, што тычыцца канкрэтнага адказу, дык канечне ў Беларусі створаны клас бізнесменаў, якія ў гэтых новых дарагіх аўто, па сутнасці, рабы. Чалавеку дазволена жыць добра. Мець добрае аўто і жыць у добрых дамах і катэджах. Але ён пры гэтым мае вельмі нетрывалае становішча. Ну і другая група – чыноўнікі. Улада дае сваім людзям, якія ёй служаць верай і праўдай, жыць па-сучаснаму. Але гэта тая столь, якой у нас можа чыноўнік дасягнуць. Бо ўласны самалёт ці ўласную яхту ці маёмасць за мяжой – гэта ўжо лічыцца звышбагаццем. І таму нікому не дазволена. Таму ўзровень жыцця падвышаецца. І ніколі так добра, як цяпер, ніхто ў Беларусі не жыў. Бо ў савецкія часы быў прыкладна такі самы лад, як цяпер. Але не было паездак за мяжу і дарагіх аўто.

**БАРЫС, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## “ГЭТА АД БЕДНАСЦІ”

Сапраўды, у нас аўтамабіляў шмат. Нават больш, чым у Лазане са Страсбургам. А тлумачыцца гэта нашым галодным савецкім дзяцінствам. Хочацца ўсяго і адразу. Прыгожага жыцця хочацца. Якое для савецкага чалавека перш-наперш увасоблена ў аўтамабілі. Гэта там, на Захадзе мільянер можа на фольксвагене падруліваць да свайго маёнтка коштам у шмат мільёнаў. Наш чалавек хутчэй будзе жыць у хрушчобе, але першыя свае сур’ёзныя грошы аддасць на колы. Маючы тысяч сорак, ён можа тысяч трыццаць выкласці на аўто. Каб самому сабе давесці сваю “крутасць”.



## “СЕМ ГАДОЎ АДРАДЖЭННЯ”

**Выйшла ў свет кніга Сяргея Навумчыка, прысвечаная найноўшай беларускай гісторыі.**

20 жніўня сябры КХП БНФ правялі ў музеі Янкі Купалы ў Вязынцы імпрэзу на тэму маскоўскага путчу 1991 году. Падчас яе была прадстаўленая новая кніга былога дэпутата, а цяпер супрацоўніка Радыё Свабода Сяргея Навумчыка “Сем гадоў Адраджэння, альбо фрагменты найноўшай беларускай гісторыі (1988-1995)”.

У кнізе, між іншым, расказваецца і пра падзеі жніўня 1991 году вачыма дэпутата Вярхоўнага Савету Беларусі ад апазіцыі БНФ, пра тое, хто і што рабіў у беларускай палітыцы ў тыя часы. Аформіў кнігу і напісаў да яе прадмову Зянон Пазняк.

Кніга Сяргея Навумчыка выйшла накладам 1 тысяча асобнікаў. Дзеля гэтага, а найперш дзеля зместу знайсці яе ў афіцыйнай кнігарні немагчыма. Затое можна чытаць у інтэрнэце, адрас: www.bielarus.net/wp-content/navymczyk-7hadou.pdf

**РС**

# ДВОЕ З АСУДЖАНЫХ СЯБРОЎ "ПАРТНЁРСТВА" — НА ВОЛІ

*21 жніўня былі вызвалены з-пад варты сябры ініцыятывы «Партнёрства» Аляксандр Шалайка і Эніра Браніцкая, якія адседзелі шэсць месяцаў за тое, што спрабавалі наладзіць незалежнае назіранне на выбарах прэзідэнта РБ.*

Раніцай стала вядома, што іх выпусцяць каля 11-гадзіны. На гэты час пад сценамі следчага ізалятара ГУУС Мінгарвыканкама (на "Валадарцы") сабралася каля трох дзясяткаў чалавек: сваякі, калегі, журналісты. А. Шалайку і Э. Браніцкую віталі воплескамі, падарылі ім букеты з бел-чырвона-белых кветак.

Астатнія двое сяброў "Парнтёрства" Мікола Астрэйка і Цімох Дранчук, асуджаныя адпаведна на два і адзін год калоніі агульнага рэжыму, застаюцца за кратамі.

Вера Шалайка прыйшла на сустрэчу з мужам цяжарная другім дзіцём. Пра тое, што ў яго будзе другі сын, Аляксандр даведаўся на чацвёрты дзень пасля арышту, калі адвакат прынес даведку з паліклінікі. Чакае дзіця таксама Паліна Астрэйка, у Цімоха Дранчука ў сакавіку нарадзіўся сын Платон.

**Паводле СМІ**



***Па выхадзе на волю** актывістку "Партнёрства" Эніру Браніцкую вітаюць кветкамі. Мінск, 21 жніўня 2006 года.*

# КОНКУРС У ПАДПОЛЬНЫ ЛІЦЭЙ – ЧАТЫРЫ ЧАЛАВЕКІ НА МЕСЦА

*Каля васьмі дзясяткаў навучэнцаў працягваюць займацца ў Гуманітарным ліцэі імя Якуба Коласа.*

Прэстыжная навучальная ўстанова – Беларускі гуманітарны ліцэй пачаў сваю працу 1 кастрычніка 1991 году.

Загадам Міністэрства народнай адукацыі БССР ад 23 верасня 1991 году на базе нядзельнага ліцэя, арганізаванага за год да гэтага паводле ініцыятывы прадстаўнікоў навуковай і творчай інтэлігенцыі, быў створаны стацыянарны Беларускі гуманітарны ліцэй. Ён пачаў працу 1 кастрычніка 1991 году.

У 2003 годзе быў падпісаны загад Міністэрства адукацыі аб ліквідацыі ліцэя, ліцэістаў выселілі з іх будынка на вуліцы Кірава, 21 у Мінску, аднак ліцэй захаваўся: бацькі і дзеці не пагадзіліся з палітычна матываваным рашэннем уладаў і заняткі працягваліся ў хатніх умовах, у офісах грамадскіх арганізацый, нават за мяжой.




Штогод ліцэйская сям'я пашыраецца. І не толькі коштам новых навучэнцаў. Прыходзяць выкладчыкі, якія гэтаксама мусяць прызвычайвацца да незвычайных рэалій "партызанскай школы". Летась сюды прыйшоў малады настаўнік Сяргей Русецкі. Сёлета на ім адказнасць двайная – даручылі класнае кіраўніцтва адной з груп першакурснікаў.

"Для іх усё гэта новае, – кажа Сяргей Русецкі, – новыя выкладчыкі, у кожнага з якіх свае патрабаванні, у кожнага свае мадэлі выкладання і г.д. І я ведаю як класны кіраўнік, што дзеці ў захапленні. І яны вельмі баяцца "вылецець" адсюль, таму ўжо гэта пра нешта гаворыць".

**Паводле Радыё Свабода**

# 15 ГАДОЎ ТАМУ БЫЛО СТВОРАНА БЗВ




**Мікола Статкевіч** *выступае на мітынгу. Плакат пачатку 1990-х гадоў.*

20 жніўня 1991 году патрыятычна настроеныя афіцэры і грамадскія дзеячы стварылі Беларускае згуртаванне вайскоўцаў (БЗВ).

У арганізацыю тады ўвайшлі самыя розныя людзі, шляхі якіх праз некалькі гадоў разышліся. Сярод актывістаў БЗВ і тыя, хто абараняў палітычныя і грамадзянскія правы беларусаў – такія, як Валеры Костка, Уладзімір Барадач. Былі таксама вядомыя дзеячы культуры — Артур Вольскі, Алег Трусаў. А быў і такі дзеяч, як Віктар Шэйман, што зрабіўся пазней бліжэйшым паплечнікам Лукашэнкі. Зараз Шэйман узначальвае дзяржаўны сакратарыят Рады бяспекі Беларусі.

Заснавальнік БЗВ М. Статкевіч цяпер зняволены за арганізацыю пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў і рэферэндуму 1995 году. У інтэрвью Радыё Свабода ён згадаў колішнюю акцыю БЗВ "Забытая слава", калі агульным накладам паўтара мільёна ва ўсіх асноўных газетах краіны быў надрукаваны агляд вайсковай гісторыі Беларусі.

З цягам часу амаль усе актывісты БЗВ былі звольнены з войска без уліку званняў і заслуг. Выключэнне было зроблена толькі для Віктара Шэймана.

У 2000 годзе арганізацыя не прайшла перарэгістрацыі і была ліквідавана.

**Паводле РС.**

# КАМУ Ў БЕЛАРУСІ «ЖЫЦЬ ХАРАШО»?

## КРАСЦІ МІЛЬЁНЫ ДАЗВОЛЕНА ТОЛЬКІ «НАБЛІЖАНЫМ ДА ЦЕЛА»

► СТАР.1

дэнта ці кіраўніка БТ – за тое, што пакралі многія мільёны даляраў. А звычайны беларус на такое толькі рукамі развядзе. Маўляў, пакажыце мне, дзе тое месца, дзе такія грошы вядуцца і дзе іх можна скрасці, я хоць пагляджу, што такое бывае...

Бывае, але не для звычайнага беларуса. Красці мільёны ў нас дазволена толькі людзям, "набліжаным да цела". Дырэктарам заводаў, кіраўнікам вертыкалі і прэзідэнцкіх СМІ. Падкрэсліваю – дазволена красці, бо ні зарабіць такія грошы, ні нарасціць іх на сваіх банкаўскіх рахунках законным шляхам немагчыма. Сацыяльны стандарт вертыкальшчыка даўно сягануў за чатырохзначныя ў далярах лічбы, а ўпісаць такія лічбы ў афіцыйную ведамасць – таксама немагчыма, бо звычайны беларус, пабачыўшы гэта, можа і за касу схапіцца. Таму – дазволена красці. Як за саветамі ў калгасе. Усе ведалі, што ўсе крадуць, бо на заробак не пражывеш, але справы ўзбуджаліся толькі тады, калі чалавек аддаляўся ад "цела" старшыні, станавіўся нявыгадным.



**Першы Мінскі аўтасалон**, *24 траўня 2006 году.*

Спосабаў дазволенага крадзяжу за апошнія 12 гадоў вертыкальная фантазія прыдумала не так і шмат. На першым месцы тут – дзяржаўныя кампаніі. Узяць хоць бы тую "пліткаманію", калі кожны горад і раён аўральным парадкам засцілаецца тратуарнай пліткай. Грошы ў гэтай справе круцяцца велізарныя. Пліткуюцца плошчы, ходнікі і нават праезная частка. У выніку гарады і весі нібыта прыгажэюць, але ў сутнасці гэта – тыя самыя "панты", што і машына за $100 тысяч. Бо па-першае, узімку плітка ператвараецца ў суцэльную траўманосную коўзанку, па-другое, праз два гады, калі яе трэба будзе рамантаваць і паднаўляць, грошай на гэта ўжо не будзе. Але я зноў пра іншае.

Каб закласці пліткай адзін беларускі раён і пасля сачыць за пакрыццём, на добры розум, трэба ў гэтым раёне стварыць прадпрыемства па вытворчасці пліткі. Такое прадпрыемства ніколі б не стаяла, давала б працоўныя месцы і пазбаўляла ад вялікіх транспартных выдаткаў. Але гэта на добры розум і – з прыцэлам на перспектыву. А ў нашай сітуацыі плітка кладзецца аўралам, аднаразова, бо купляецца не ў дзяржавы, а ў прыватных прадпрыемстваў – чым даражэй і пажадана з другога канца Беларусі. Тлумачыцца проста – прыватнік, у адрозненне ад дзяржавы, робіць вертыкальшчыку "адкат". Таму здзелка і выглядае як наскок. Ударылі па руках і разышліся. Як у моры караблі.

Альбо вось яшчэ ўказ прэзідэнта пра ўлік і знос лядашчых хатаў. Гэта – кампанія для падкормкі вертыкальшчыкаў ніжэйшага звяна – у сельсаветах. Яны зараз у масавым парадку прыватызуюць тыя лядашчыя хацінкі разам з патэнцыяльна залатымі ўчасткамі зямлі – на вазеры, на рэчцы, на прыгожым краявідзе — за капейкі, каб тут жа прапанаваць іх гарадскім таварышам за некалькі тысяч $ — пад загарадны дом, дачу ці катэдж.

Грошы, якія прыносяць вялікія і малыя здзелкі, зараз жа і ўкладаюцца – у гэтыя самыя катэджы з зямлёй і ў тыя самыя "лексусы", прычым усё афармляецца на сваякоў, знаёмых і дзяўчат. Вось адкуль так шмат тых "лексусаў" на сталічным праспекце.

Нехта скажа – а куды ж глядзяць праваахоўныя органы? Яны ўсе глядзяць у бок "цела". Тады – куды ж глядзіць "цела"? А "цела" ўсё бачыць і ні пра каго не забывае. Бо дазволены крадзёж мае свой другі бок медаля – кампрамат. І кожны дырэктар завода, кожны вертыкальшчык, кожны кіраўнік БТ – у нашага "цела" на ўліку з усімі сваімі шахер-махерамі і здзелкамі. Крадзіце, хлопцы, але служыце верна, бо інакш ваша дасье імгненна ляжа на стол пракурору.

Вось яны і крадуць – многія, я думаю, вымушана. Бо інакш дасягнуць свайго сацыяльнага і грамадскага стандарту не змаглі б. Яны крадуць, бо крадуць усе ў іхнім асяроддзі. І ўсе, як адзін, ведаюць, што яны на кручку, што крок управа, крок улева... Таму і здаецца нам, што ўсе яны церпяць яго аднога, калі ён абяцае абламаць ім рогі, і што аднойчы іх цярпенню прыйдзе канец. Але гэта не так. Гэта яму аднойчы прыйдзе канец, а ўжо разам з ім палятуць у прорву і ўсе яны. Бо дыктатары заўсёды і па ўсім свеце былі не тым каменем, які ляжыць на вяршыні сваёй уласнай вертыкалі, а тым краевугольным, які ляжыць у падмурку.

**Сяргей Паўлоўскі**
s.paulouski@tut.by

# ГАЗАВАЯ МІСТЫКА

## “РАСІЯ ЗАГРАЗЛА Ў БЕЛАРУСІ”, – ЛІЧЫЦЬ РАСІЙСКІ ПАЛІТОЛАГ

Газавая датацыя Беларусі з боку РФ у 2006 г. складзе больш за 3 мільярды USD (больш як 300 долараў на кожнага беларуса).

Фактычна, Расія толькі ў форме газавай прэферэнцыі сёлета выплачвае ўсю гадавую пенсію двум з паловай мільёнам беларускіх пенсіянераў (каля 2-х мільярдаў долараў), пра што яны нават не здагадваюцца, і за адзін месяц — усю заработную плату ўсім беларусам. Пры гэтым, варта зазначыць, ёсць яшчэ і амаль дваццаць мільёнаў тон расійскай нафты, якая ў выглядзе беларускіх нафтапрадуктаў ліецца на галандскія і брытанскія тэрміналы. Так што не ў цэхах МТЗ і мінскага “Крышталю” трэба шукаць сакрэт беларускага эканамічнага “працвітання”…

Пры канцы студзеня 2006 г. Аляксандр Лукашэнка абяцаў публічна расказаць пра сустрэчныя льготы і прэферэнцыі, якія Расія атрымлівае ад Беларусі на суму не меншую за тыя самыя 3 мільярды расійскай газавай датацыі. «У нас газ паводле рынкавай цаны, мы нічога Расіі не павінны». Але свайго абяцання Лукашэнка не выканаў.

Возьмем другі прыклад. 95% беларускіх ЦЭЦ і кацельні працуюць на расійскім газе. Між тым, вытворчасць электрычнай энергіі ў Беларусі знізілася з 39,5 мільярдаў кілават-гадзін (1990 г.) да 30,9 мільярдаў кілават-гадзін (2005 г.). Прамысловая вытворчасць таксама ніжэй, чым было ў 2005 годзе. Нягледзячы на шырока разрэкламаваную заяву А. Лукашэнкі, што беларуская эканоміка ўжо дасягнула ўзроўню апошняга году жыцця СССР, у большасці фізічных паказчыкаў яна ніжэй, чым у 1990-м годзе. Зніжэнне вытворчасці пацвярджаюць звесткі Міністэрства прыроды Беларусі за 1990-2005 г. пра зніжэнне выкідаў у атмасферу парніковых газаў, у пераліку на вуглекіслы газ — з 112 мільёнаў тон да 57 мільёнаў тон за год.

Тут пачынаецца газавая містыка…

За той самы перыяд спажыванне газу ў Беларусі вырасла з 12 мільярдаў кубаметраў да 21 мільярда кубаметраў за год (2001 г. – 1650 $м^3$, 2003 г. – 1850 $м^3$, 2006 г. – 2100 $м^3$, план да 2015-2020 г. – 2400 $м^3$ на душу насельніцтва – нечуваны ў Еўропе ўзровень). Пры гэтым цяпер на душу насельніцтва Беларусь спажывае газу столькі, колькі ЗША, у 2 разы больш, чым ФРГ, маючы пры гэтым у 15-20 разоў меншы паказчык ВУП на аднаго чалавека. Такое ўражанне, што Беларусь ператварылася ў гіганцкую газавую камфорку, на якой мільярдамі “кубоў” “выпарваецца” расійскі газ. Аднак, варта нагадаць, што выкіды вуглекіслага газу ў атмасферу скараціліся больш як удвая! Калі паглыбіцца ў гісторыю пытання, дык выявіцца, што скачок у пастаўцы газу ў Беларусь амаль у тыя самыя два разы (зноў удвая – містыка!) адбыўся за Рэмам Вяхіравым – папярэднікам Аляксея Мілера на пасадзе кіраўніка ЗАТ «Газпром». Загадка, якая не мае рашэння, прынамсі, пры цяперашняй уладзе ў Мінску, – куды дзяюцца амаль 10 мільярдаў кубоў расійскага газу штогод? Спажыць іх у Беларусі немагчыма.

Формула «нафта – газ – транзіт» ляжыць не толькі ў аснове «беларускай эканамічнай мадэлі», але і другое дзесяцігоддзе забяспечвае трываласць пануючага ў Мінску рэжыму. Аднак пасля прэзідэнцкіх выбараў у канцы сакавіка 2006 году кіраўніцтва «Газпрома» нагадала: «Даўжок!» У Маскве не даравалі афіцыйнаму Мінску газавыя абяцанні Лукашэнкі, зробленыя 15 снежня 2005 г. у Сочы. Безумоўна, прэзідэнта РБ, які ўсю сваю палітычную кар’еру пабудаваў на прынцыпе “Пераможцаў не судзяць!”, глыбока абурыла маскоўская “няўдзячнасць”.

**Фактычна, Расія толькі ў форме газавай прэферэнцыі сёлета выплачвае ўсю гадавую пенсію двум з паловай мільёнам беларускіх пенсіянераў (каля 2-х мільярдаў долараў), пра што яны нават не здагадваюцца**

Палічыўшы сябе адзінай палітычнай стаўкай Расіі на выбарах 2006 году, Лукашэнка быў цвёрда ўпэўнены, што “палітычная цана” за газ 2006 году — 46,68 USD за 1000 кубаметраў — гэта дабрачынны ўнёсак Расіі ў яго электаральную перамогу. Перамога была дасягнута, «унёсак» Расіі “спрацаваў”, але раптам Масква запатрабавала за сваю падтрымку павялічыць цану газу спачатку ўдвая – да 100 USD г. зн. «даплаці за перамогу» (сакавіцкая прапанова ЗАТ «Газпром»), а пасля сустрэчы Лукашэнкі з Пуціным 28 красавіка ў Санкт-Пецярбургу цана вырасла да 200 USD – расійскае кіраўніцтва пераканалася ў неадэкватнасці Лукашэнкі, які ўступіў у трэці тэрмін пад лозунгам «я ўсіх вас перасяджу».

1 жніўня на сустрэчы з пасламі Лукашэнка выступіў з прамовай, у якой запабягаў перад Вашынгтонам, а транзітны статус Рэспублікі Беларусь прадставіў стрыжнем не толькі беларускай эканомікі, але і міжнароднай палітыкі. Фактычна ён паўтарыў шмат якія праграмныя ўстаноўкі Беларускага Народнага Фронту першай паловы 90-х г., узгадаўшы і “Балта-Чарнаморскі энергакалектар”.

Фармальна Мінск выйграў вясenova-летні раўнд газавых перамоваў. Яму ўдалося ўцягнуць «Газпром» у шматмесячныя бясплённыя манеўры вакол «Белтрансгазу».

Гэтым вырашаецца галоўная тактычная задача: зацягнуць перамовы да снежня, чым паставіць «Газпром» перад фактам неабходнасці адключаць Беларусь ад газу. Убачыўшы перад сабой не самотны Мінск, а ўсю кансалідаваную на прыкладзе расійска-ўкраінскага газавага крызісу студзеня 2006 г. Еўропу, «Газпром» саступіць, Беларусь застанецца з амаль бясплатным газам, а Лукашэнка — з легітымнасцю ад ЕС і нават ад Вашынгтона.

Тым самым напалову будзе вырашана стратэгічная задача: Лукашэнка павінен вытрываць да лета 2007 году. З чэрвеня 2007 г. Расія ўцягнецца ў перадвыбарны марафон, затым яшчэ мінімум два гады новай крамлёўскай адміністрацыі будзе не да Мінска. У выніку тэрмін спакойнага паразітавання Беларусі на расійскіх фінансах і рэсурсах працягнецца да 2010 году. А там можна будзе заняцца і чацвёртым тэрмінам.

**Андрэй Суздальцаў,**
Масква
www.glavred.info
(Друкуецца ў скароце)

**Ад рэдакцыі:** *Андрэй Суздальцаў – расійскі палітолаг, які да нядаўняга часу жыў у Мінску. Сёлета напярэдадні выбараў ён быў прымусова дэпартаваны з Беларусі без права вяртацца цягам пяці гадоў. У Мінску засталася яго сям’я.*

“Саюздрук“

# КСЕНІЯ СІТНІК ЯК СІМВАЛ СССР

## АЛЬБО “САМАНДЫ” НАПРАКАТ

Уявіце, што вы засталіся без незалежных сродкаў інфармацыі. Няма ні Інтэрнэта, ні “Еўраньюс”, ні “Свабоды” з “Нашай Нівай”. Ёсць толькі дзяржаўная мінская прэса. Перспектыва жахлівая. Бо тое, што сёння друкуецца на старонках афіцыйных газет, часам пераўзыходзіць публікацыі самых застойных часоў.

Зазірнем у газету “Советская Белоруссия” за 17 жніўня. Барыс Ляпешка ў артыкуле “Бессилие перед историей” робіць намаганні супакоіць аўдыторыю, якая 15 гадоў запар, нібыта, сумуе па развaленым СССР.

“Ведь очевидно: события 1991 года принесли на нашу землю много бед и в общественном сознании стойко живет неприятие такого рода «решения» истории. Однако нельзя забывать и иное: не будь тех событий, не было бы и суверенной страны Беларусь, избранного народом Президента. И вообще, много чего бы не было... И победы белорусской сборной по хоккею над шведами, и... Скорее всего, не было бы столь эффектного появления Ксении Ситник на детском «Евровидении». Вряд ли бы мы столь эффективно формировали свою национальную элиту. Спорно, что появился бы именно такой роскошный «кубик» Национальной библиотеки”.

Чытаю і думаю: якіх такіх “много бед” прынеслі нам падзеі 1991 году? Клопатаў і праблем, вядома, паболела. Але болей тады стала і свабоды, і праўды, і магчымасцяў. Незалежнасць сваёй краіны – найвялікшы здабытак для кожнай нацыі. Перамагчы шведаў і “Еўравізію”, а таксама збудаваць “кубік” мы цалкам маглі і ў складзе СССР. Пра якое фармаванне якой “нацыянальнай эліты” піша спадар Ляпешка, мне зноў незразумела. Элітай у беларусаў заўсёды – і ў часы СССР таксама – былі пісьменнікі. Тыя самыя, на творах якіх выхоўваюцца новыя пакаленні беларусаў. Тыя самыя, у якіх сёння адабраў Дом Літаратара “выбраны народам Прэзідэнт”. Можа быць, гэта яго мае на ўвазе падступны спадар Ляпешка, калі піша пра “много бед”?

У той самай прэзідэнцкай газеце за 18 жніўня акадэмік Анатоль Рубінаў у артыкуле “Еще раз об идеологии” тлумачыць беларусам, чым і кім ім трэба ганарыцца.

“Не события средневековой давности, не победы в далекий период Великого княжества Литовского (...) должны быть источником гордости белорусского народа. Предметом подлинной гордости должна быть исключительная способность и восприимчивость белорусов к прогрессу и цивилизации. Именно это позволило нашему народу из нищей, неграмотной страны построить в кратчайшие исторические сроки современное цивилизованное европейское государство”.

Ну проста цытата з Мікалая Мураўёва, які ашчасліўў “нищих и неграмотных” беларусаў. Пасля яго ўжо бальшавікі ашчаслівілі нас – зноў, чамусці, “нищих и неграмотных”. Былі яшчэ палякі, немцы, зноў бальшавікі. А беларусы перад кожным новым рэжымам зноў аказваліся “нищими и неграмотными”. Цяпер нас ашчасліўлівае спадар Рубінаў. Няясна толькі, у чым заключаецца наша “цывілізаванасць” – без грамадзянскіх свабод і роўных магчымасцяў, і ў чым наша “еўрапейскасць”, калі патрапіць у Еўропу мы можам толькі як азіяты ці афрыканцы – па візах. І ў чым наш прагрэс? Хіба што ў статысячных заробках на сяле? У паўсюднай боязі гаварыць тое, што думаеш? Ці ў празмернай раскошы кіраўніцтва і прыўладнага бізнеса?

Яшчэ глыбей у гісторыю занурыўся іншы аўтар. Нехта Мікалай Сяргееў у газеце “Белорусская нива”, у рубрыцы “Интересно знать”, адукоўвае чытачоў у “вопросах языкознания”.

“В период Великого княжества Литовского и Русского, а затем и Речи Посполитой (вплоть до XVIII века) на Белой Руси была создана обширная литература на русском языке. Более того, все государственное делопроизводство в Великом княжестве велось на языке, который не только именовался русским, но и был таковым по существу. Все это свидетельствует о том, что наши земляки внесли неоценимый вклад в становление и развитие русского языка, который является неотъемлемой частью самосознания и культуры белорусского народа. Русский язык — это общее достояние России и Беларуси”.

Гэтаксама як сёння нас, беларусаў, прымазваюць да мовы А.С.Пушкіна, раней прымазвалі да мовы А.Міцкевіча – з тым самым поспехам. Беларус – тое самае, што паляк, гучала гэтаксама, як беларус – тое самае, што рускі. Яно, вядома, хочацца падладзіцца да нейкай вялікай культуры, але прырода замінае. І колькі ты рускім ці палякам ні выстаўляйся, а ўсё адно вылазіць беларус. Таму выснова простая – кожны сам мусіць несці свой крыж і збіраць свае ўласныя плады.

Вельмі павесяліла “Народная газета”. На яе старонках генеральны дырэктар аб’яднання “Белбыт” Ганна Лаўрукевіч дзеліцца планамі на “аграгарадскую” будучыню. Манілаў адпачывае.

“Самые востребованные сейчас на селе услуги, — сообщила журналистам Анна Лаврукевич, — ремонт обуви, ремонт и пошив одежды, парикмахерские. Минский опытно-механический завод научился оборудовать передвижные рабочие места для парикмахера, обувщика, швеи. Самые перспективные услуги, на которых можно заработать, — ремонт и прокат автомобилей, ремонт помещений и мебели, изготовление столярных изделий, а в будущем, возможно, и обработка приусадебных участков”.

Цікава, у якіх рэгіёнах Беларусі будзе наладжаны пракат аўтамабіляў? Не інакш, пашанцуе ўсходняй Магілёўшчыне. Дзе часам адну “жывую” машыну можна сустрэць праз кіламетраў дваццаць пустыннай дарогі. Хочацца верыць, што даваць на пракат працаўнікам вёскі будуць беларуска-іранскія “Саманды”. Бо купіць іх за 12 тысяч баксаў наўрад ці захоча як міфічны шчаслівы калгаснік, гэтак і рэальны чалавек з грашыма.

**Зміцер Канюціч**




**Надпіс на цаглянай тумбе** *пасярод калгаснага поля. Беларусь, жнівень 2006 г.*

## ФОТАФАКТ



# МЁРТВАГА СТАЛІНА ВУШЫ

## ЛЯ ЗАСЛАЎЯ ЎЗВЯЛІ БЮСТ ГЕНЕРАЛІСІМУСА

Бюст Сталіна ў так званым гісторыка-культурным цэнтры "Лінія Сталіна" блізу Заслаўя ўсталявалі хутка і без вялікай помпы. Амаль незаўважна для шырокай грамадскасці. Проста трэба было, відаць, зрабіць нешта прыемнае прэзідэнту Венесуэлы Уга Чавесу падчас яго нядаўняга візіту ў Беларусь. Кажуць, той недзе назваў сярод сваіх куміраў Фідэля Кастра, Чэ Гевару і Іосіфа Сталіна. Спяшаліся да прыезду высокага госця так, што забыліся напісаць на пастаменце не толькі імя скульптара і архітэктара (помнік жа трэба было ўпісаць у ландшафт), але нават імя таго, чый бюст усталявалі. Скульптуру, аднак, пазнаюць здалёк, і кіроўцы аўто міжволі прытармошваюць на шашы, спрабуючы ўцяміць – што гэты сон азначае?

Турыстаў, якія жадаюць сфатаграфавацца на фоне правадыра, чакае, праўда, непрыемны сюрпрыз – у Сталіна нехта адбіў вушы. Ад гэтага каменны ідал набыў яшчэ больш фантасмагарычны і ад таго жудасны выгляд. Цяпер ён як жывы…

**З.Гур**
**фота аўтара**

## ДНІ

**24 жніўня** – галоўнае дзяржаўнае свята ва Украіне – Дзень незалежнасці. Звычайна ў гэты дзень у Кіеве адбываецца вайсковы парад і тэатралізаваная дзея, што адлюстроўвае 1000-гадовую ўкраінскую гісторыю. Такім чынам украінцы адзначаюць дзень 24 жніўня 1991 года, калі парламент большасцю галасоў ухваліў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Украіны. Аналагічнае свята ў Беларусі было адменена А.Лукашэнкам.

**25 жніўня** 1953 году нарадзіўся беларускі пісьменнік Уладзімір Арлоў, аўтар дзясяткаў кніг у самых розных жанрах, якога на літаратурных сустрэчах маглі бачыць жыхары ўсіх гарадоў і мястэчак краіны. Арлоў піша гістарычную прозу, эсэістыку і вершы.

**26 жніўня** 1933 году была прынятая сумнавядомая пастанова Савета Народных Камісараў БССР "Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу". Гэты дакумент стаў яшчэ адной вяхой выцяснення роднае мовы з шырокага грамадскага ўжытку. У выніку той пастановы распаўсюдзілася меркаванне пра "грубасць беларускага языка". Гэта не дзіўна, бо найбольш прыкметнай ахвярай "рэфарматараў" стаў мяккі знак. Большасць мавазнаўцаў краіны не прынялі той пастановы і былі рэпрэсаваны – расстраляныя ці сасланыя ў ГУЛАГ.

**27 жніўня** ў 1820 годзе расійскі цар Аляксандр І падпісаў указ пра забарону дзейнасці езуітаў у Расійскай імперыі. Для Беларусі гэта быў удар па ўсёй сістэме адукацыі, бо менавіта сябры "Таварыства Ісуса" засяродзілі ў сваіх руках усю сярэднюю і вышэйшую адукацыю на тэрыторыі нашай краіны. Езуіцкія акадэміі і калегіюмы дзейнічалі ў нас больш за 200 гадоў, давалі якасную еўрапейскую адукацыю і выпусцілі мноства вучоных, грамадскіх дзеячоў і пісьменнікаў.

**28 жніўня** 1929 году ў БССР быў праведзены "Дзень калектывізацыі". Толькі за адзін гэты дзень у краіне былі створаны 143 калгасы. Эмісары кампартыі спяшаліся абвесціць Беларусь зонай суцэльнай калектывізацыі, таму меркаванне сялян пра абагульненне іх прыватнай маёмасці не ўлічвалася. Сотні тысяч нязгодных гаспадароў паплаціліся за свае пратэсты свабодаю і жыццём, а сама калектывізацыя стала ўрэшце галоўнай партыйнай кампаніяй у часе масавага сталінскага тэрору.

**29 жніўня** ў Беларусі традыцыйна адзначаецца Трэці Спас. Пасля Першага – мядовага і Другога – яблычнага, Трэці Спас называлі хлебным або арэхавым, што было звязана з пасяваннем арэхаў. А яшчэ **29 жніўня** 1944 году тэрыторыя Беларусі была цалкам вызвалена ад нямецкіх захопнікаў.

**30 жніўня** ў 1954 годзе нарадзіўся Аляксандр Лукашэнка, першы прэзідэнт Рэспублікі Беларусі, які, насуперак Канстытуцыі, займае гэтую пасаду трынаццаты год.

# ДЗЕСЯЦЬ СУТАК ЗА ЗАЎВАГУ ДЗЯРЖАЎНАМУ ТЭЛЕАПЕРАТАРУ

## АКТЫВІСТЫ САЮЗУ ПАЛЯКАЎ БЕЛАРУСІ ЛІЧАЦЬ ПРЫСУД СВАЙМУ СЯБРУ ПАЛІТЫЧНАЙ РАСПРАВАЙ

22 жніўня сябра непрызнанага афіцыйнымі ўладамі Саюзу палякаў Беларусі (СПБ) журналіст Анджэй Пачобут быў асуджаны Гродзенскім судом на дзесяць сутак адміністрацыйнага арышту за “дробнае хуліганства”. Яшчэ адзін абвінавачаны – Мечыслаў Яскевіч быў у судзе апраўданы, хоць і правёў перад гэтым пад арыштам разам з Пачобутам чатыры дні.

Сябры СПБ, якія прысутнічалі ў судовай зале, сустрэлі прысуд воклічамі: “Ганьба!” “Нас хочуць знішчыць!”

Пачобута і Яскевіча затрымалі 18 жніўня ўвечары. Іх абвінавацілі ў тым, што яны нібыта перашкаджалі тэлеаператару дзяржаўнага тэлебачання Андрэю Бялятку і рэдактару Уладзіміру Лобану здымаць урачыстасці, прысвечаныя Войску польскаму, арганізаваныя польскім консульствам у Гродне. Міліцыя склала пратакол на Пачобута і Яскевіча на падставе заявы намесьніцы кіраўніка абласнога тэлерадыёаб’яднання Алены Прымачэнкі.

Пачобут заявіў у судзе, што сапраўднай прычынай яго арышту стала запланаванае пасяджэнне Рады СПБ на чале з Анжалікай Борыс. Журналіст падкрэсліў, што міліцыя спрабавала перашкодзіць сябрам гэтай арганізацыі сабрацца ў Гродне, а ён аб гэтым пісаў у прэсе.

Суддзя Зінаіда Барцэвіч апытала некалькіх сведкаў, у тым ліку Анжаліку Борыс. Сведкі абароны паказалі ў судзе, што ні Пачобут ні Яскевіч, насуперак сведчанням міліцыі, не краналі і не абражалі тэлеаператара абласной тэлестудыі. Пачобут хацеў толькі высветліць, якую тэлекампанію той прадстаўляе. Сведкі падкрэслілі, што на камеры не было ніякай эмблемы ці надпісу, і аператар не паказваў свайго пасведчання, з-за чаго яго прынялі былі за супрацоўніка КГБ. Аператару Бялятку зрабілі заўвагу, каб ён не таптаў магілаў і не ставіў камеру на катынскі крыж, але той ніяк не рэагаваў.

**Паводле www.gazeta.pl**




"Вчера на белорусско-польской границе неизвестные обстреляли мирно пашущий белорусский трактор. В ответ на эту провокацию трактор был вынужден подняться в воздух и ответить серией ракетных залпов по группе неизвестных, после чего крылатая машина взяла курс на хоз.двор.

По данным белорусских спецслужб этот налёт был отработкой на практике знаний, полученных белорусскими террористическими группами, проходящими подготовку в Познани.

Руководство колхоза "Красный комиссар" опровергает данные польской стороны что трактор атаковал обьекты на территории Польши. Так же, председатель колхоза, полковник Сидоренко отметил, что, если провокации продолжатся - то вдоль границы будет пахать уже не трактор а комбайн"

**belzhaba.com**

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер”
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by)
**Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Падпісана ў друк** 24.08.06
**Тыраж** 299 экзэмпляраў
**Распаўсюджваецца** бясплатна.